

# 19/19

# DEUTSCHE FILME IM ORIGINAL

GOETHE INSTITUT

19. Februar 2015, 19.00 Uhr

## Hannah Arendt

Spielfilm, Deutschland, Luxemburg, Frankreich, Israel, 2012
Regie: Margarethe von Trotta
Länge: 100 Min.
Sprache: Deutsch mit russischen Untertiteln

Ein Film über berühmte deutsch-jüdische Persönlichkeit des öffentlichen Lebens, Philosophin, Politologin, Pädagogin Hannah Arendt (1906-1975). Im Mittelpunkt des Sujets – die Ereignisse der drei Jahre ihres Lebens, 1961-1964, wo Korrespondentin The New Yorker Hannah Arendt im Auftrag der Zeitung nach Jerusalem fährt, um da den Gerichtsprozess über einen der Holocaustverbrecher Adolf Eichmann zu beleuchten. In ihren Bemühungen die Natur des nazistischen Judenhasses zu versehen, hat sie sorgfältig die Gerichtmaterialien notiert, analysiert und danach in Artikeln jenseits des Ozeans zusammengefasst. Das von ihr gemalte Bild hat in den davor herrschenden Rahmen nicht herein gepasst. Die neu promulgierte Herangehensweise hat eine Empörungswelle gegen Hannah Arendt hervorgerufen und hat viele Menschen in Gegner und Anhänger dieser außergewöhnlichen Frau geteilt.

19. März 2015, 19.00 Uhr

## Drei

Spielfilm, Deutschland, 2011
Regie: Tom Tykwer
Länge: 119 Min.
Sprache: Deutsch mit deutschen Untertiteln

Seit 20 Jahren sind Hanna und Simon ein Paar. Sie sind attraktiv, modern, gereift, kinderlos, kultiviert, ernüchtert. Fremdgehen, Kinderwunsch, Zusammenziehen, Fehlgeburten, Flucht und Rückkehr: die Kulturmoderatorin und der Kunsttechniker haben vieles hinter sich, aber nicht mehr ganz so viel vor. Bis sich beide, ohne voneinander zu wissen, neu verlieben.
Lässig und konzentriert erzählt Tom Tykwer in seinem neuen Film von einer außergewöhnlichen Liebesgeschichte, und erweist sich dabei erneut als Meister über Zufall und Schicksaal.
DREI ist eine Spurensuche im Gefühlsleben einer Generation, die versucht, ihre Möglichkeiten und alten Sehnsüchte in Einklang zu bringen.

20. April 2015, 19.00 Uhr

## Oh Boy

Spielfilm, Deutschland, 2012
Regie: Jan Ole Gerster
Länge: 82 Min.
Sprache: Deutsch mit deutschen Untertiteln

Niko Fischer lebt einfach in den Tag hinein. Sein Jura-Studium hat er abgebrochen. Er streut durch Berlin, beobachtet verwundert die Menschen in der Stadt und lässt sich treiben. An diesem Tag wird alles anders: Nikos Vater stellt die monatlichen Zahlungen ein, mit der Freundin klappt´s nicht mehr, ein Psychologe entzieht ihm den Führerschein, ein Nachbar klagt Niko sein Leid und beginnt zu heulen, eine Bekannte aus der fernen Schulzeit macht ihn an und in einer Kneipe erzählt ihm ein alter Mann von einem traumatischen Kindheitserlebnis. Am Ende ist der alte Mann tot und Niko hat vielleicht zum ersten Mal so etwas wie Anteilnahme und Verantwortungsgefühl gezeigt. Es wird endlich Zeit für ihn, erwachsen zu werden. OH BOY erzählt in Episoden von turbulenten 24 Stunden aus dem Leben eines jungen Mannes, an deren Ende nichts mehr sein wird wie vorher.

19. Mai 2015, 19.00 Uhr

## Kaddisch für einen Freund

Spielfilm, Deutschland, 2011
Regie: Leo Khasin
Länge: 94 Min.
Sprache: Deutsch mit deutschen Untertiteln

Ali Messalam ist 14. Aufgewachsen in einem libanesischen Flüchtlingslager, hat er vor klein auf gelernt, „die Juden" zu hassen. Nach Jahren der Flucht lebt er nun mit seiner Familie in Berlin. Dort sucht er Anschluss bei den Jugendlichen im Kiez. Doch er soll erst beweisen, was er drauf hat. Das Ziel dieser Mutprobe ist Alexander Zamskoy, russischer Weltkriegsveteran und Jude, der allein in der Wohnung über Ali wohnt. Mit Alis Hilfe dringen die Jugendlichen bei Alexander ein und verwüsten die Wohnung. Ali aber wird als Einziger von seinem vorzeitig zurückgekehrten Nachbarn erkannt und bei der Polizei angezeigt. Ali bleibt nur eine Chance: er muss Alexander helfen, dessen Wohnung soweit zu renovieren, das dieser eine günstige Sozialprognose erhält und nicht mehr zwangsweise ins Altersheim abgeschoben werden kann. Widerwillig machen sich die beiden an die Arbeit…

19. Juni 2015, 19.00 Uhr

## Sascha

Spielfilm, Deutschland, 2010
Regie: Dennis Todorović
Länge: 101 Min.
Sprache: Deutsch mit deutschen Untertiteln

Das Leben kann verdammt kompliziert sein, wenn man neunzehn ist, schwul und heimlich in seinen Klavierlehrer verliebt. Sascha lebt noch bei seinen Eltern, die aus Montenegro stammen. Der Migrationshintergrund der Familie ist ebenso Ausgangspunkt für die Geschichte wie das lange Coming-out des jungen Mannes. Saschas Mutter sieht in ihrem Sohn einen großen Konzertpianisten, während der Vater daran glauben möchte, dass Sascha eine Freundin hat und eines Tages in die Heimat zurückkehrt. Ein Film über Immigranten in einer deutschen Großstadt, den Alltag einer Familie in einem multikulturellen Viertel und die Schwierigkeiten, über sexuelle Neigungen offen zu sprechen.



**19/19 – Deutsche Filme im Original**

Am 19. eines jeden Monats um 19 Uhr lädt das Goethe-Institut Minsk zur Vorführung eines deutschen Films in Originalfassung ein.

**Ort:**

Goethe-Institut Minsk, ul. Very Chorushej 25/3, Veranstaltungsraum in der 4. Etage. Eintritt frei.

**igor.kuksin@minsk.goethe.org**
**+375 17 237 71 19**

www.goethe.de/minsk



# 19/19

# НЯМЕЦКІЯ ФІЛЬМЫ Ў АРЫГІНАЛЕ

GOETHE INSTITUT

19 лютага 2015 года, 19:00

## Ханна Арэнт

Мастацкі фільм, Германія, Люксембург, Францыя, Ізраіль, 2012
Рэжысёр: Маргарэта фон Трота
Працягласць: 100 хвілін
Мова: нямецкая з рускімі субтытрамі

Фільм пра знакамітую нямецка-яўрэйскую грамадскую дзеячку, філосафа, палітолага, педагога Ханну Арэнт (1906-1975). У цэнтры сюжэта – падзеі толькі трох гадоў яе жыцця з 1961 да 1964, калі яна карэспандэнткай газеты The New Yorker накіравалася ў Іерусалім асвятляць працэс над адным з арганізатараў Халакоста Адольфам Эйхманам. Намагаючыся разабрацца ў прыродзе фашысцкай нянавісці да яўрэяў, яна рупліва занатоўвала і аналізавала матэрыялы суда ў артыкулах, якія з'яўляліся за акіянам. Пад пяром даследчыцы узнікала карціна, якая супярэчыла агульнапрынятаму погляду. Абнародаваны ёю новы падыход выклікаў хвалю абурэння супраць яе і падзяліў шмат людзей на прыхільнікаў і праціўнікаў гэтай незвычайнай жанчыны.

19 сакавіка 2015 года, 19:00

## Трое

Мастацкі фільм, Германія, 2011
Рэжысёр: Том Тыквер
Працягласць: 119 хвілін
Мова: нямецкая з нямецкімі субтытрамі

Ужо 20 год Ганна і Сімон жывуць разам. Яны прывабныя, сучасныя, спелыя, бяздзетныя, культурныя . Яна – тэлевядучая культурных праграм. Ён – тэхнік у галіне мастацтва. Здрада, жаданне мець дзіця, жыццё разам, выкідышы, уцёкі і вяртанне: у іх шмат чаго за плячыма, але не так шмат наперадзе. Пакуль аднойчы кожны з іх закахаецца, патаемна ад іншага.

Нязмушана і сканцэнтравана Том Тыквер расказвае ў сваёй новай стужцы незвычайную гісторыю кахання і яшчэ раз пераконвае нас у сваім майстэрстве апавядання пра выпадак і лёс.

Трое – гэта даследаванне эмацыйнага жыцця пакалення, што намагаецца ўраўнаважыць свае магчымасці і свае страсці.

20 красавіка 2015 года, 19:00

## Простыя складанасці Ніка Фішара

Мастацкі фільм, Германія, 2012
Рэжысёр: Ян Оле Герштэр
Працягласць: 82 хвіліны
Мова: нямецкая з нямецкімі субтытрамі

Ніка Фішар жыве бестурботным жыццём. Навучанне на юрыдычным факультэце ён кінуў. Валэндаючыся па Берліне, ён са здзіўленнем назірае за жыхарамі горада. Але ў гэты дзень усё інакш: Нікаў бацька не жадае больш штомесяц даваць яму грошы, справы з сяброўкай не ладзяцца, псіхолаг адбірае ў яго вадзіцельскія правы, сусед раскрывае Ніка сваю душу, знаёмая з далёкіх школьных часоў прыстае да яго, а нейкі стары ў бары дзеліцца з ім траўматычнай гісторыяй свайго дзяцінства. Урэшце стары памірае і Ніка ахоплівае – пэўна, ўпершыню – нешта падобнае да спачування і пачуцця адказнасці. Для яго надыходзіць час станавіцца дарослым. “Простыя складанасці Ніка Фішара” малюе перад глядачом эпізоды бурных 24 гадзін з жыцця маладога мужчыны, напрыканцы якіх ужо нічога больш не будзе такім, як было раней.

19 мая 2015 года, 19:00

## Кадзіш для сябра

Мастацкі фільм, Германія, 2011
Рэжысёр: Лео Хасін
Працягласць: 94 хвіліны
Мова: нямецкая з нямецкімі субтытрамі

Алі Месаламу 14 гадоў. Ён вырас у ліванскім лагеры для бежанцаў і з дзяцінства навучыўся ненавідзець “яўрэяў”. Праз гады бежанскага жыцця ён пераязджае з сям'ёй у Берлін. Там ён спрабуе далучыцца да кампаніі падлеткаў свайго квартала. Але спачатку ён павінен даказаць, на што ён здольны. Мэтай такога выпрабавання становіцца рускі яўрэй Аляксандр Замской, ветэран Другой сусветнай вайны, які жыве ў кватэры над Алі. З дапамогай Алі падлеткі прабіраюцца ў кватэру Аляксандра і ўсчыняюць там вэрхал. Але гаспадар вяртаецца нечакана рана і Алі становіцца адзіным, каго пазнае сусед. Справа пападае ў паліцыю. Алі застаецца толькі адзін шанец: ён павінен дапамагчы Аляксандру прывесці кватэру ў такі парадак, каб сацыяльныя службы пераканаліся ў здольнасці Аляксандра весці гаспадарку і перасталі пагражаць яму прымусовым перасяленнем ў дом састарэлых. Супраць сваёй волі абодва бяруцца за работу...

19 чэрвеня 2015 года, 19:00

## Саша

Мастацкі фільм, Германія, 2010
Рэжысёр: Дэніс Тадаровіч
Працягласць: 101 хвіліна
Мова: нямецкая з нямецкімі субтытрамі

Жыццё можа быць неверагодна складаным, калі табе дзевятнаццаць, ты гей і патаемна закахаўся ў свайго выкладчыка па піяніна. Саша жыве са сваімі бацькамі, якія пераехалі з Чарнагорыі. Міграцыйная мінуўшчына сям'і адыгрывае такую ж важную ролю ў гэтай гісторыі, як і замоўчванне мужчынам сваёй арыентацыі. Сашына маці бачыць у сваім сыне вялікага піяніста, у той час як бацька спадзяецца, што ў Сашы ёсць сяброўка і ён аднойчы вернецца на сваю радзіму. Гэта фільм пра лёс імігрантаў у нямецкім мегаполісе, пра будні сям'і ў мультыкультурным квартале і пра тое, як скаладана шчыра гаварыць пра свае сексуальныя схільнасці.



**19/19 – Нямецкія фільмы ў арыгінале**

Дзевятнаццаты дзень кожнага месяца а 19-й гадзіне Інстытут імя Гётэ ў Мінску запрашае на прагляд нямецкага кіно на мове арыгінала.

**Месца правядзення:**

Інстытут імя Гётэ ў Мінску, вул. Веры Харужай, 25/3, канферэнц-зала на 4-м паверсе. Уваход вольны.

**igor.kuksin@minsk.goethe.org**
**+375 17 237 71 19**

www.goethe.de/minsk